**Аляксандрава, З.** За службу на граніцы / З. Аляксандрава // Браслаўская звязда. — 1990. — 13 лют. — С. 2.

# ЗА СЛУЖБУ НА ГРАНІЦЫ



Цяпер нярэдка можна пачуць, што Афганістан быў палітычнай памылкай. Балюча і горка ўсё гэта ўсведамляць. Ды і ці змогуць калі-небудзь з гэтым выказваннем згадзіцца маці, чые сыны загінулі на афганскай зямлі, жонкі, чые мужы не вярнуліся ў свае сем'і, маладыя хлопцы, якія засталіся калекамі, кожны, каму давялося перажыць сапраўдную вайну з усімі яе жахамі, бачыць як паміраюць сябры і знаёмыя, зусім маладыя хлопцы. Для ўсіх іх тая вайна ў Афганістане назаўсёды застанецца ў памяці. Хоць раны з гадамі і зарубцоўваюцца, аднак раны сэрца, душы не-не ды і даюць аб сабе знаць.

Суровую школу службы ў Афганістане прайшлі і некаторыя браслаўчане. Многія з іх маюць дзяржаўныя ўзнагароды, Цяпер гэтыя юнакі паступова ўліваюцца ў наша мірнае жьшцё.



Аб некаторых з іх, хто выконваў інтэрнапыянальны абавязак у ДРА неаднойчы пісала наша газета. А сёння я хачу расказаць яшчэ аб адным такім былым воіне, які ахоўваў мірнае наша жыццё на граніцы з гэтай краінай.

На апошнім пленуме райкома ВЛКСМ многія камсамольскія актывісты прысутнічалі пры уручэнні медаля «За адвагу» члену ВЛКСМ Міраславу Слівіцкаму. Гэта ўжо яго другая ўзнагарода. Першы медаль «За выдатную службу па ахове дзяржаўнай граніцы» Міраслаў атрымаў мінулым летам. Зусім малады юнак, які нарадзіўся і вырас у наш мірны час, мае дзве ўрадавыя ўзнагароды. Хто ж ён, які ён, наш сучаснік?

...У дзяцінстве нічым асаблівым сярод сваіх равеснікаў не выдзяляўся. Быў, можа, крыху больш сціплы, сарамлівы, чым іншыя падлеткі. І зусім нешматслоўны. Гэтыя рысы характеру і цяпер больш за ўсё ўласцівы Міраславу.

З маленства хлопец прывучаны да працы. Заўсёды дапамагаў маці ўпраўляцца па хатняй гаспадарцы. Калі закончыў восем класаў, вырашыў пайсці вучыцца ў Друйскае СПТВ, каб зноў быць бліжэй да дому і побач з роднымі. Пасля заканчэння вучылішча яго прызвалі на службу ў армію. Для вясковага хлопца вайсковая служба не была цяжкай. Фізічнай працы ён не цураўся таму і да армейскіх нагрузак прывык хутка. Пачынаў на іранскай граніцы. Менавіта там спасціг сакрэты службы пагранічніка. А калі ў часць прыехалі

набіраць добраахвотнікаў на граніцу з Афганістанам, выклікаўся ў ліку першых. Больш года ахоўваў Міраслаў мірнае жыццё савецкіх грамадзян, несучы варту на граніцы.

Што ж кіравала ім у тыя хвіліны, калі прыняў цвёрдае рашэнне пайсці служыць на граніцу з краінай, дзе ішла вайна? Ведаў жа, што будзе нялёгка, рыхтаваўся да самага страшнага. Але ж у першую чаргу разумеў, што некаму трэба быць там. Дык чаму ж некаму? Чаму нехта, а не ён, павінен рызыкаваць жыццём, сутыкацца з усімі складанасцямі і цяжкасцямі? Таму, доўга не раздумваючы, прыняў для сябе адзінае рашэнне.

Можа таму, што па характару вельмі сціплы, можа ад таго, што балюча ўспамінаць усё ўбачанае і перажытае, але Міраслаў так нічога і не расказаў мне аб сваей службе. Што ж, яго можна зразумець, Успамінаць усё гэта не вельмі прыемна.

У лютым 1989 года ён звольніўся ў запас. Працаваць уладкаваўся памочнікам экскаватаршчыка ПМК-44.

«Працаўнік ён выдатны, – так характарызуюць яго ў калектыве меліяратараў. – І хоць нядаўна яшчэ працуе, аднак па яго адносінах да абавязкаў бачна, што хлопец старанны, добрасумленны. Ды і па чалавечых якасцях — шчыры, добразычлівы таварыш. Паважаюць яго ў нас».

Вось такі ён, наш сучаснік, які жыве з намі побач, такі ж, як і ўсе мы астатнія. І ўсё ж, ён у свае дваццаць год ужо шмат чаго паспеў убачыць і перажыць.

**З. Аляксандрава**

**Фота Т. Панцялейкі**